і «культуралогія» — гэта ідэнтычныя паняцці, навошта тады ўжываць абедзве дэфініцыі?

Мы мяркуем, адбываецца гэта таму, што яшчэ не ўсталяваўся строгі навуковы падыход да гэтай праблемы. Безумоўна, пошукі карэктнага падыходу — працэс аб'ектыўны, і ён дасць свой плён.

**Печанко М.Ф.,** *дацэнт*

## ІНТЭЛІГЕНТНАСЦЬ ЯК ФЕНОМЕН КУЛЬТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод праблем культуралагічнага зместу праблема інтэлігентнасці, духоўнасці, несумненна, з'яўляецца адной з найгалоўнейшых. Яна ў роўнай меры датычыцца і культурнай палітыкі, і адукацыі, і выхавання, і сферы паўсядзённага жыцця.

Перш чым змястоўна раскрыць абазначаную з'яву, варта даць некалькі дэфініцый, якія з розных пунктаў гледжання дазваляюць раскрыць сутнасць паняцця інтэлігентнасці. У даведачна-энцыклапедычнай літаратуры пануе, галоўным чынам, навукова-рацыяналістычны змест паняцця «інтэлігентнасць». Яно вызначаецца як вышэйшы ўзровень развіцця інтэлекту, як адукаванасць ці высокая культура паводзін. Гэта тлумачыцца тым, што дух, духоўнасць, інтэлігентнасць, адукаванасць у еўрапейскай філасофскай традыцыі (пачынаючы з часоў Асветніцтва і асабліва ў нямецкім ідэалізме) разглядаліся ў пазнавальным ключы як адносіны свядомасці да рэчаіснасці. Так, у Гегеля пад інтэлігентнасцю разумеецца пазнанне, розум, інтэлект. Таму інтэлігентнасць у гэтым сэнсе выражала сабой разумовую, інтэлектуальна-духоўную дзейнасць суб'екта пазнання і ведаў, іх ступень развіцця, атрыманую праз адукацыю.

Зразумела, што інтэлігенцыя па сутнасці сваёй з'яўляецца носьбітам духоўнай традыцыі і ўключаецца ў культурна-

гістарычны працэс. Праз інтэлігенцыю ажыццяўляюцца адукацыя (навучанне і выхаванне асобы), духоўная творчасць і сувязь паміж пакаленнямі, уключэнне ў традыцыйную нацыянальную і сусветную культуру, асэнсаванне рэлігійных каштоўнасцей, г.зн. фарміраванне інтэлектуальнай і маральна-этычнай культуры асобы, яе інтэлігентнасці.

У гісторыі савецкай культуры інтэлігенцыі адводзілася роля пераважна апалогіі ідэйна-палітычнай дактрыны і служэння афіцыйнаму курсу. Невыпадкова ў наменклатуры сталінскай сацыялогіі інтэлігенцыя вызначалася як праслойка, як штосьці другаснае, не вызначальнае. Гэта, натуральна, звузіла змест паняцця інтэлігентнасці. У яго ўкладваўся ідэалагічны сэнс.

У пераломныя моманты гісторыі Расіі (і не толькі Расіі) у канцы XIX-пачатку XX ст. асабліва востра паўсталі пытанні аб інтэлігенцыі і інтэлігентнасці, іх ролі і месцы ў захаванні і развіцці культуры, духоўных традыцый, аб нацыянальнай самасвядомасці і гістарычнай свядомасці як гуманітарных праблемах, якія асэнсоўваюцца праз гуманітарую адукацыю.

Інтэлігентнасць, народжаная рэвалюцыйным рамантызмам, стыхіяй пераўтварэння свету, напоўнена пафасам стварэння і аптымізму. Гэта ваяўнічая пазіцыя актыўнага саўдзелу, евангельскай любові да блізкага праз умяшанне ў яго суб'ектыўны свет нарадзіла месіянскія адносіны да інтэлігенцыі і разам з тым ідэю яе ўсеагульнай адказнасці. У Расіі гэта ішло ад народніцкай інтэлігентнасці, з яе пазіцыяй даравання і спачування, надзелу агульнай адказнасці і лёсу, патрыятычнай абароны народнай культуры.

Інтэлігентнасць, народжаная рэвалюцыйна-пралетарскай культурай,— гэта тып інтэлігентнасці, заснаваны на ідэі калектыўнага шчасця, свабоды і роўнасці, існуючых на падставе сацыяльнай справядлівасці. Гэта абумоўлівала сувязь ведаў і дзеяння, рэлятыўнай маральнай пазіцыі і альтруізму, ахвярнасці і подзвігу. Такое разуменне інтэлігентнасці ўвасоблена ў рускай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэлігійнай філасофіі пачатку XX ст. у думках М.А.Бярдзяева, С.М.Булгакава, А.І.Ільіна і інш. Вось што піша адносна гэтага А.Ф.Лосеў: «Сапраўдная інтэлігентнасць заўсёды ёсць подзвіг, заўсёды ёсць гатоўнасць забывацца на надзённыя патрэбы эгаістычнага існавання: не абавязкова бой, але штохвілінная гатоўнасць да бою і духоўная творчая ўзброенасць для яго. І няма іншага слова, якое магло б найбольш ярка выразіць такую сутнасць інтэлігентнасці, чым слова «подзвіг».

Інтэлігентнасць, згодна з Лосевым,— гэта штодзённае і штогадзіннае нясенне подзвігу, хаця часта патэнцыяльнае. Але подзвіг не ёсць самамэта і свавольства, а ёсць дзеянне ці задума ў імя выратавання свету і чалавека, гуманітарная акцыя. Зразумела, што тут вызначаецца інтэлігентнасць як асобаснае выражэнне культуры, накіраванае на соцыум дзеля дабрабыту і гармоніі як галоўнай мэты. У гэтым лёгка выяўляюцца хрысціянскі пафас, канкрэтная ахвярнасць у імя выратавання культуры і гісторыі, і гэта надае інтэлігентнасці як духоўнаму феномену некаторы сакральны сэнс.

Інтэлігентнасць выражае здольнасць (індывідуальную або калектыўную) выратоўваць свет праз пошук і ўсталяванне гармоніі свядомасці і рэальнасці, суб'ектыўнага сэнсу і аб'ектыўнай прычыны праз акт творчасці і самарэалізацыі. «Выратоўваць свет трэба не гордасцю чалавека сваім усведамленнем перад светам ніжэйшых істот, а ўзгадненнем творчасці, сваёй свядомасці з творчасцю быцця ў адзіны сусветны творчы акт»,— пісаў у дзённіку рускі мысліцель М.М.Прышвін.

Ніхто не вырашае гэтую праблему так старанна і дбайна, як інтэлігенцыя, асабліва гуманітарная (філосафы, пісьменнікі, мастакі, музыканты). І гэта можна растлумачыць. Гуманітарыі ідуць ад герменеўтычнага вопыту, ад разумення культурных асноў і раскрыцця іх сэнсаў і значэнняў для новых сацыякультуных працэсаў.

У гэтым плане гуманітарызацыя адукацыі накіравана на глыбокае культурна-гістарычнае, а не толькі ідэалагізавана-палітычнае асэнсаванне нацыянальнага існавання і яго модусаў — мінулага, сучаснага, будучага, на спасціжэнне духоўнай гісторыі свайго народа і народаў свету.

Можна вылучыць, канешне, умоўна асноўныя два тыпы інтэлігентнасці. Гэта інтэлігентнасць, якая вырасла на ведах, на навуковай адукаванасці і імкнецца прыйсці да ісціны праз аналіз, падмацаваны мэтазгоднасцю і логікай, і інтэлігентнасць, якая ўзнікла на аснове разумення, глыбокага сузірання і асабістай уключанасці ў дзейнасць. Першая выступае як навуковы логас, дзе пануюць розум і разумовы парадак, дзе вельмі важна даказаць як факт, што, несумненна, важна для арганізацыі культурнай дзейнасці, адукацыі і выхавання. Такая інтэлігентнасць можа быць кваліфікавана як прафесійная адукаванасць, якая не ставіць перад сабой гуманітарных праблем. Гуманітарызаваная інтэлігентнасць — гэта хутчэй за ўсё асобасная культура, арыентаваная на індывідуальнасць, на яе ацэнку і ўласнае асэнсаванне. Ёй уласцівы жыццяразуменне і ціхмяная мудрасць, што заснаваны на сапраўдным усведамленні чалавекам культуры, разуменні ім духоўнага жыцця, сацыякультурнага вопыту набыцця дасканаласці і праз нацыянальную культуру, і праз народную духоўнасць, і праз рэлігійнае светаўспрыманне.

У гісторыі станаўлення і развіцця інтэлігентнасці можна вылучыць розныя варыянты ўзаемадзеяння названых з'яў. Вядома, як будаваліся адносіны і даваліся ацэнкі адукацыйна-асветніцкай інтэлігентнасці (г.зн. кніжнай мудрасці, якая прыйшла на славянскія землі з Захаду) з боку жыццеарыентаванай мудрасці і натуральна-прыроднай культуры, у асноўным язычніцкай. З аднаго боку, адбывалася пераасэнсаванне ўласнай культуры, ладу жыцця, ментальнасці, з другога — параўноўваліся духоўнасці, асіміляваліся іншыя каштоўнасці, тыпы адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хрысціянска-праваслаўнае светаўспрыманне і тып культуры, якія прыйшлі як кніжная мудрасць, выражалі сабой іншы тып інтэлігентнасці, жыццямудрасці праз прысваенне Духу і Веры, г.зн. асаблівай духоўнай культуры. Асветніцкая інтэлігентнасць і хрысціянская культура па-рознаму ўзаемадзейнічалі ў еўрапейскай культурнай традыцыі, што добра ілюструецца гісторыяй адукацыі і рэлігіі.

Гуманітарная культура ўключае значэнні і сэнсы не толькі грамадзянскага свету і свецкай духоўнасці, але і хрысціянскія каштоўнасці, што сінтэзаваліся ў інтэлігентнасці як у заходняй, так і ў рускай, і беларускай духоўных традыцыях. Авалоданне гэтай культурай — адна з важнейшых задач гуманітарнай адукацыі гістарычна-герменеўтычнага накірунку, кампаратывістыкі. Нельга зразумець усёй складанасці праблемы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці без даследавання і глыбокага разумення развіцця інтэлігентнасці, яе гісторыі і сучаснасці.

Культуралагічны падыход да праблемы духоўнасці, інтэлігентнасці па сутнасці сінтэтычны, а не аналітычны. Ён уключае як тэарэтычны аспект, сэнсавы, так і гістарычны, а таксама кампаратыўны, дыяхронна-сінхронны, што дае магчымасць убачыць культурныя дамінанты і праз народныя фальклорныя традыцыі, і праз хрысціянскія, канфесіянальныя. Таму важна не толькі даследаванне якога-небудзь феномена культуры праз сацыялогію культуры або этнаграфічна, але і праз уключэнне яго ў дыяхронна-сінхронную пазіцыю, праз параўнанне, супастаўленне ў сістэме гуманітарнай адукацыі і выхавання.

Вядома, што духоўная культура існуе як сістэма каштоўнасцей, праз выбар якіх суб'ект уключаецца ў культурнае існаванне, соцыум. У гэтым выпадку інтэлігентнасць можна разглядаць як асобасную здольнасць і гатоўнасць да выбару каштоўнасцей, г.зн. як духоўную свабоду. Змест інтэлігентнасці залежыць ад багацця суб'ектыўнага вопыту, ад індывідуальнасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якая ўжо стала асобай. Менавіта асоба акумулюе вопыт, які з'яўляецца сацыяльнай праявай індывідуальнасці, індывідуальнасць таксама выражае глыбіню інтэлігентнасці. Разважаючы ў гэтым аспекце, А.Ф.Лосеў піша: «Інтэлігентнасць ёсць індывідуальнае жыццё або функцыі асобы, якую разумеюць як згустак прыродна-грамадска-гістарычных адносін».

У інтэлігента, як правільна заўважыў А.Блок, «каштоўнасці не рэчаісныя», яны трансцэндэнтныя, ідэальныя і ляжаць толькі на межах суб'ектыўнага вопыту і культуры грамадства, якія інтэлігент асімілюе праз сваю суб'ектыўнасць. Таму зразумела, што станаўленне інтэлігентнасці дапускае не пасіўную адукацыю (як настаўленне або навучанне), а ўласную ўнутраную дзейнасць, цесна звязаную са светапоглядам, псіхалогіяй і маральнасцю.

Існуе яшчэ адна, на наш погляд, важная філасофска-культуралагічная праблема — праблема сапраўднай культуры, на аснове якой магчыма і сапраўдная інтэлігентнасць.

Дэгуманізаваная культура XX ст., якая адышла ад гуманітарных ідэалаў цэласнага і сапраўднага існавання чалавека, ад гармоніі сутнасці і існавання, пра што пісалі А.Уайльд, Х.Артэга-і-Гасэт, К.Ясперс, М.Нардаў, М.Бярдзяеў і інш. філосафы і культуролагі, усё больш арыентавала на каштоўнасці цывілізацыі, на калектыўныя прынцыпы і нормы жыццядзейнасці, на масавыя феномены. Філасофія і этыка індывідуалізму, якія спачатку ўзніклі ў эпоху гуманізму, а пазней вызначаліся як дробнабуржуазная культура, далі свае плады, нарадзіўшы інтэлігентнасць свабоднай асобы, індывідуальнасці, якая прадузята ставілася да сацыякультурных змен. Гэта цяжарам лягло на свядомасць інтэлігенцыі канца XIX —пачатку XX ст., раскалоўшы інтэлігентнасць, духоўнасць на культурна-гуманістычную і навукова-прагрэсіцкую, тэхнакратычную, выходзячую за межы народнай культуры, традыцый, нацыянальна-гістарычнага і духоўнага вопыту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчая дзейнасць, уключаючы права на індывідуальны выбар, была пастаўлена перад фактам сапраўдных каштоўнасцей, існуючых як унутры нацыі, рэлігіі, так і ў сусветнай культуры. Плюралізм культурных сітуацый змяніў статус нацыянальнай мовы і традыцыі, іх суадносіны з этнічным, архаічным пластом культуры праз сродкі цывілізацыі (кантакт, камунікацыя, абмен і г.д.) і выклікаў да жыцця эрзацкультуру, субкультурныя і контркультурныя працэсы.

Менавіта гэта з усёй вастрынёй паставіла праблему сапраўднай культуры, культурнай ідэнфікацыі і трансфармацыі каштоўнасцей, праз якія генерыруецца і рэгенерыруецца інтэлігентнасць.

**Дарашэвіч Э.К.,** *прафесар*

## ДЫЯЛОГ ЯК ПРЫНЦЫП КУЛЬТУРАЛОГІІ

Дыялог як форма суразмоў'я вядомы яшчэ з часоў антычнасці. Класікай гэтага жанру прынята лічыць дыялогі Платона, падробкі пад якога былі вельмі распаўсюджаны. Але з цягам часу яны захаваліся толькі ў мастацкай літаратуры. Высока ставіў сутнасць дыялагічнага супастаўлення думак Георг Вільгельм Фрыдрых Гегель, аднак адмаўляўся ад дыялога Платона.

М.М.Бахцін, звярнуўшыся да дыялога як мастацкага метаду (аналіз творчасці Ф.М.Дастаеўскага), разгортвае і даводзіць яго да культуралагічнага прынцыпу. Некаторыя падыходы да універсальнай трактоўкі дыялога ўзніклі ўжо у віцебскі перыяд жыцця і творчасці выдатнага вучонага.

Сутнасць канцэпцыі дыялога выяўляецца у кнізе аб Дастаеўскім («Проблемы творчества Достоевского», 1929), дзе ў